Данута Бічэль

# Нёман ідзе

*Вершы*

Выдавецтва
„Беларусь”
Мінск
1964

*Грамадскі рэдактар*
*Р. Барадулін*

*Мастак*
*І. Немагай*

* * *

...Шчочку да вуснаў туліць,
Каб таямніцу спытадь:
— Белая Русь,
Матуля,
Гэта дзяўчынка?
Так?
Як называецца дзіўна...
Ты пра яе раскажы...

— Белая Русь —
Радзіма,
Перад табой ляжыць.

Крыкні —
Яна адгукнецца
Звонам гарачых кос.
Кропля з ліста сарвецца,
Ускалыхнецца плёс.

Даль захлынецца громам —
Белая Русь запяе.
І азарыцца Неман —
Чыстае вока яе...

* * *

Я падумала пра ракету,
Як яна адплывае ў космае...
Мне тады прыгадаўся колас.

Вылез ён з зялёнай цямніцы
На танюткай, як промень, сцяблінцы.
Паківаў галавой сусвету,—
Наліваецца сілаю стаў...
Так развітваедца ракета
Перад тым, як пакінуць старт.

**С о н**

Недзе за лесам далекім,
Недзе за сінім аўсом,
Поплечкі з ветрыкам лёгкім
Блукае па свеце сон.

Стукае звыкла ў вокны,
Для ночкі красёнкі тчэ.
Сон зазірае ў вочкі,
Крадзецца сон да вачэй.

Подыхам знікне ў жыце,
Хваляю праплыве,
Як мама,
Малую Віцю
Пагладзіць па галаве.

Спаць пакладзе калыханку,
Цішаю ахіне,
І перад самым ранкам
Зморанны сон
Засне.

* * *

А на Нёмане —
Крыгаход.
Крыгі-востравы,
Нібы роздумы...
А навошта ты
Кожны год
Мне прыносіш
Прыстані-ростані?

Я сама пакуль
Не паверыла,
Не прыходзіла ў галаву,
Што ад гэтага ветру,
Ад берагу,
Ад самой сябе
Адплыву...

* * *

Мажа сядзем з табой за вёслы
І павернем
У тыя вёскі,
І павернем
У тыя вёсны,
Дзе не хмарыцца,
Дзе не старыцца,
Дзе наіўна і хораша марыцца.

І цяпер там
Гайдаецца лісце,
Дзе спаткаліся мы калісьці...

## С т о м а  і  п е с н я

Касцы а касавіцы песню
На кончыках косаў неслі.
Дадому,
Праз лес,
Наўпроста —
Лёгкую,
З мяккіх пракосаў,
Апошнюю песню красак
Са стомай паўдзённай разам..
Касцы паўдарогі пранеслі.
Нарэшце
У сасновым лесе
Стома скарылася песні.
Адстала стома ад песні.
На хвоі сівыя апала...
З буйной расой растала...

## К а л о ж а

Каложа!
Каложа мая прыгожая!
Ты і ў завею, як летам, пагожая.
Клёнам тваім, пэўна, сто гадоў,
А можа іх пасадзіў Міндоўг?
Любая крона паўнеба засціць,
З паўсвету птаства
Тут знойдзе засень.
Там недзе звіта
Гняздо для месіка.
Сядзіць ён, ножкі у Нёман звесіўшы.
А Нёман цячэ сабе ўдаль,
як звычайна,
Стагоддзямі вербы
да хваль прыручае,
Жартуе і лашчыць,
пяшчотны залішне;
Над кручай закруціць нядобрыя мыслі,
Свавольную думку знайсці дапаможа...
Вясновая песня мая, Каложа!
Калі над табою сцені мярэжацца,
Чакаюць спатканні
На кожнай сцежачцы...
Калыска вякоў неспакойных,
Каложа!
Няхай твае сны
Ніхто не трывожыць.
І вера і цвёрдасць мая —

Каложа...
О, колькі прайшло
Праз цябе раздарожжаў...
Крушылі, палілі,
Дратамі скручвалі,
А ты, як зямля, была неўміручая...
Ты й на заходзе,
Як поўдзень сонечны,
Васьмівяковая,
І заутра —
Сённяшняя.
Нішто цябе
З сэрца вырваць не зможа,
Бяссмерце продкаў маіх —
Каложа!

**Калыханка**

Спі, мая дачушка,
Засынай, дзяўчо...
Заінька пад вушка
Падлажыў сучок,
І не кукарэкае
Пеўнік на двары...
Спі, мая заранвчка,
Да зары.

Гэтую песеньку,
Што спяваю я,
Мне калісьці пела
Бабка твая,
Навучыла бабку
Маці яе...
Ты яе таксама запяеш...

Песенька даўнейшая.
На старэнькі лад...
«У тваёй матулі
Працы шмат,
У тваёй матулі
Ручкі пякуць...
Спі, мая зязюлька,
Не кукуй.
Засынай, стракозка,
На цэлую ноч.
Заўтра зойдзе сонца

У акно,
У шэранькія вочкі зазірне…
Весела праменьчыкам падміргне.

Некалі падміргвала гэтак мне…

## **Н ё м а н у**

Трывожныя думкі дарог
Заўсёды вядуць да дябе.
А сёння з духмяных бароў
Ты сам
Насустрач прыбег.

Стаю з берагамі ў рост,
Не ў сілах адвесці вачэй,
А ты ўдалячьшь наўпрост
Праз сэрца мае цячэш.

І — рук загарэлых ўзмах —
Па хвалах лёгкі удар.
Я стану табой сама —
Пайду, паплыву
Удаль.

## Р а н а к

На палі,
На дрэвы
І на праслы
Апускаецца паволі яснасць.
Па шырокім, неўгамонным плёсе
Нетаропка сонца разлілося,
Нехта цішу цэдзіць
Млявай жменяй…
Меней…
Меней…

* * *

Не лаві заранак,
Бо яшчэ зарана:
Не закінуць невад
Малайцу на неба.
Патапчы дарожкі,
Павучыся трошкі.
Каб не памыліцца,
Пакапай зямліцу…
Мару не забудзеш,
Ў хмарах не заблудзіш,
Тады тое й будзе.
Тады тое й будзе.

## Ч о р н ы я  з о р ы

Тыя чорныя промні,—
Ім гарэць...
Не згарэць...
На імгненне прыпомню
Аж сэрца замрэ.
Тыя чорныя зоры
З адценнем смугі
Патанулі ў азёрах
Невядомых,
Другіх...

Толькі мару і сёння,
Каб калі-нікалі
Тыя вочы ў прадонне
Мяне завялі.

Заўсміхаліся ветліва,
Як раней з-за гары,
Тыя самыя дальнія,
Тыя самыя светлыя,
Тыя самыя чорныя
Дзве зары...

* * *

З табою расставаліся —
Настыгла хмары скрыгалі.
Над Нёмнам затрымаліся,
А ён пакрыўся крыгамі.
А ён пакрыўся холадам,
Сапе,
Як звер,
Заснежаны.
А плыў калісьці горадам
Зімою
Без адзежыны.
А мы ішлі
Па інею,
А мы сляды пакінулі.
Каталіся
На лесеньках
Ад Нёмана —
Да месіка.

* * *

Босыя ногі,
Голыя плечы...
Збочыць з дарогі —
Лугам прабегчы...
Над перасохлай
Рэчкаю соннай
Выпырхнуць звонкай
Птушкаю сойкай.
Перасмяяцца,
Перамарыцца,
З ветрам-травою
Нагаварыцца...

* * *

*Радзімв*

Нібы сунічка
На. прагалку,
Сярод людзей
І ціхіх ніў
Я падрастала
дзень пры дні,
Твае сцяжынкі прабягала...

Была бяздумнаю дзяўчынай.
Жыццё мяне перавучыла.
Я заручыла ў час з табой
Сваё світанне
І любоў.

На свет я выйшла з нематы,
Бо ёсць
На гэтым свеце ты.

І стала жыць,
Як ты сама...
Ты — у зіме:
Ва мне — зіма.

Смяюся,
Калі ты ў вясне...
Не спіш —
Бяссонніца ва мне.

* * *

Там, за птушынай дубровай.
Туман ручайкі прадудь.
Бусел пасе каровы,
Паснедаўшы на хаду.

Спіць пастушок
На пяньку.
Падклаў кулачок
Пад шчаку.

* * *

Я, здаецца, зусім змарылася
І змагацца не маю сіл.
Сэрца з розумам не згаварылася
І сказала не тое зусім...
...І здалося мне раптам смешным
Маладое бяссілле мае.
І пайшла ад цябе я,
Песнямі перапоўненая да краёў...
І пайшла ў цішыню,
У гаі,
І пайшла ўдалячынь
Неабдымную.
З заінелых дрэў
Салаўі
Мне вясновую песню
Грымнулі...

## **Л о в а ц ь**

Ціхая Ловаць
Каменьчыкі ловіць.
Кінуў каменьчык —
Пырснуў струменьчык.
Шэры каменьчык...
Жоўтае дно-
Хвалі скамечаны,
Як палатно...
Шэпчуцца з ветрам
Змоўніцы-вербы.
Скача сцяжынка,
Нібы смяшынка...
Сонная Ловаць
Смяшышку ловіць.
Кінула ў хвалі,
Мы не дагналі.
Гушкае Ловаць
Жоўтую лотаць...

* * *

Салаўём на вушка пяяў:
— Будзь мая...
Вудзь мая!
...Ажаніўся —
У той жа дзень
Загудзеў,
Як авадзень;
Ні на танцы сходзіць,
Ні ў кіно,
Ані ўсмешку паслаць праз акно,
Ні з суседчыным суседам
Пасядзець,
Ні на бабінага дзеда
Паглядзець,—
А начыста галаву
Адурыў.
А па мне ты —
Хоць з русалкай гавары...

Сам падсеў да прыгажунь?
От я ж табе пакажу!

* * *

Ці сняцца табе
Хвілінаю
Вусны
З гаркотай калінавай?
Сасонка
З дзявочым позіркам,
Што зябла на росах
Позненька?..
Яна для цябе —
Бяссонніца...
Яна без цябе —
Бяздомніца...
Ці сніцца часамі?
Ці помніцца?

* * *

Шаткавалі капусту двое.
А за вокнамі спела восень.
Стукаў ножык па дошцы часценька.
Усміхалася шчасце шчасцейку.
Усе асеннія колеры, пахі
У невялікі кадоўбчык ссыпалі,
У кляновы, жоўты, як сонца.
Напаследак падспалі солі.
А як чыста было на стале,
Двое разам сабраліся ў лес.
І хадзілі сцяжынамі рознымі,
Выбіралі кіёк бярозавы,
Выбіралі сабе па густу,—
Маладым і палянка лагодзіла.
Беразінкай прабʼюць капусту,
Каб з яе гаркота выходзіла.

## Д в о е

Для саміх сябе недасяжныя,
Захмялелыя ад бяссонніцы,
Так і ходзяць яны,
Сарамяжныя,—
Па галлі,
Па раллі,
Па сонцы.
Паміж імі —
Сцяжынка сцелецца.
На яе ступіць не асмеляцца,-
Уступаюць ліповую ветліва
Светламу.

* * *

Выйду ў палі —
Лета пыліць...
Каб хмаркай паліць,—
Няма калі.
За борам сінім
Смуга асела.
Лугі скасілі.
Дыхае сена.
Косы не шастаюць.
Косы стаміліся.
Граблікі частыя
У пракосах памыліся.
Вочы гарачыя,
Што там убачылі?
Каля валочка
Цвітудь валохпкі.
Ды не валошкі,
Вочкі Алёшкі...
Гэта ж не жарты —
Хлапец не жанаты...

* * *

Сонцу,—
Яму вядома,
Каго прывітаць спачатку.
Прачнецца —
Адразу на Неман.
Сядзе ў рыбацкую чайку,
Закіне у тоні невад —
І паплыло на неба.

**Касец**

На прылессі
То дубок, то клянок —
Каля лесу
Маладзенькі лянок.
Полюць лён дзяўчаты
Босыя.
Кормяць пчоламі
І росамі.
Ішлі сцежкаю касцы
На пакос.
І адзін,
Мусіць, да верасу прырос.
Заглядзеўся ў вочы сінія —
Ці ільновыя,
Ці дзяўчыніныя?
Ды касец не разгубіўся,
Крычыць:
— Можа, дзеванькі, палоць
Памагчы?
Дружна смехам адказалі
Хлапцу:
— Хіба коска не над сілу
Малайцу?
— Пустазелле
Я касой пакашу.
А разочак пацалую —
Не укушу…
— З нас табе

Смяяцца нечага.
Цалаваць дазволім
Вечарам.
Ды на ўсіх не спадзявайся,
Выбірай адну!
— Ну і ну!

* * *

Бабіна лета —
Каб крыху пазней,
Бабіна лета...
Ці маё, ці не?

Я лясное золата
Ціха патапчу,
Быць асенняй сёлета
Надта не хачу.

* * *

Ты напаі мяне з крыніцы сэрца,
Што ад крыніц прынёманскіх прадонней.
Сагрэй мяне ў раллі сваіх далоней,—
Ва мне лісточак кожны разаўецца.

Я стану дрэвам цвёрдым і вялікім —
Пад навальніцай злою не сагнуся;
А для цябе—
Вярбовая галінка
І каташкамі да цяпла хінуся.

* * *

«Гэта снег,
толькі снег...
*Янка Купала*

«Гэта снег...
Толькі снег...»
І мяце на двары.
Гэта — ў вершы
Паэтава сэрца
Гарыць.
Гэты верш
Ен для любай
Калісьці чытаў...
Як даўно
Яго снег
Растаў!..
Ціхі спеў,
Светлы смех —
У маёй галаве.
Толькі снег,
Лёгкі снег
Над палямі плыве.

* * *

Яснымі блакітнымі вачыма
Бадьку усміхаецца сынок.
Ведама, у доме два мужчыны,
Дык яны заўсёды — заадно.

* * *

А цяпер па далёкім бары
Ходзіць цень
Да паўдня.
А цяпер у бары-гушчары
Цішыня...
Цішыня...
А над борам
Узняўся ўгору
Дуб,
Ад полымя чырваней... .
Недзе ў поўдзень застылі зоры
У сцюдзёных крыніц на дне.
...А сцяжыны прапахлі ажынаю,
Вецце гнулася да зямлі,
Пелі з птушкамі па-птушынаму,
Мы, як песні,
Самі былі.
І лавілі ў зялёным гудзе,
Бесклапотны, апошні
Смех...
Ці было гэта ўсё?
Ці будзе?
Ці, як першы снег...

* * *

Мяне лета ў горадзе скоўвае.
Я — сялянка, жанчына вясковая;
Серп зублёны начамі сніцца,
Вез работы баліць паясніца.
Я вяртаюся у жаданае,
У дзявочае, у нядаўняе...
З непрывычкі
Стала заслабая,
Не зжынаюся з дужымі бабамі.
Я ад крыўды амаль раву,
Перавяслы тугія рву
І ні стомы, ні пылу, ні часу,
Нават болю не прыкмячаю.

Зноў жняя
У свой род прынятая.
Ой, як пахне трава прымятая...

**Г а р ш к а л е п ы**

Не багі гаршкі ляпілі,—
Нас яны перунамі лупілі,—
А гаршкі ляпілі заморанья
Гаршкалепы з суседняга Морына.
Разлягаўся голас па вёсцы:
— Ганчары ідуць!
Гаршканосцы!

Я прасіла:
— Дзядуля, скажы,
Адчаго пяюць гладышы?
— Не мялі ты мне
Глупства рознае:
Ат, падумаеш, гаршкалеп!
Ён не знае, чым пахне хлеб.
Пахадзіў бы з сахой па барознах...

Не ў пашане ў дзядоў гаршкалепы,
Гэта значыдь,—
Людзі без хлеба
І без сталай сялянскай працы.
На сугліністай гаспадарцы,
Сапраўды, не багаты ўмалот —
Так па жмені збіраць штогод

А ў матулі пяе і цяпер
Той танюткі-танюткі спеў...

* * *

Першы след маланкі — баразна:
Хутка будзе сеяцца ярына.
Ручнічок закінуўшы на плячо,
Выбягала сонейка, як дзяўчо.
Борздзенька праскочыла
Цераз сад…

А туга дзявочая, як раса…

* * *

Я згадзілася неяк нехаця
У легенду з табой паехаць.
Мы з аўтобуса ў лесе выйшлі.
Як знаёмых,
Суетрэла ціша.
Незвычайна вакол было:
Пахла верасам
І смалой…
Пра зямлю гаварылі,
Пра сонца,
А яно цікавала з-за соснаў.
Разумелі,
Што гэта не вечна.
Разумелі,
Што толькі да вечара…
У сасновым разважлівым шуме
Мы аднолькава неяк падумалі:
Чалавеку патрэбна ў жыцці
Хоць часамі
Лясная ціш.

* * *

Над возерам ліпнёвы ясны дзень,
Яршы на сонцы грэюцца ў вадзе,
А мы,
Чаротамі закалыханыя,
А мы
Зусім нанова закаханыя.
Да сосен ветрык
У палон папаўся;
І пчолы
Не спяшаюцца да пасек;
І цэлы свет спакоем перапоўнен.
Ты мне сказаў...
А што?
А я не помню...

* * *

Прынеманская заранка
Бліснула з-за фіранкі.
Праменьчыкам
Дзень прабіла...
Каменьчык адзін
Растапіла.
Каменьчык гэты —
Няйначай,
Сэрца юначае.

* * *

Не называй мяне жаданай,
Я не магу пра гэта чуць.
Маўчы і ты, як я маўчу…
Не называй мяне жаданай.
Хай лепей воблачкам я стану.
Сама ад шчасця палячу.
Не называй мяне жаданай.
Я не магу пра гэта чуць...

**Стары касец**

Луг! Я твой верны сын.
Што я цяпер без касы?
Што я без рук, без сіл?
Як гэта —
Лета вакол,
Самы што сенакос,
Мне, мужыку, не касіць,
Песню ў грудзях не насіць,
Не варушыць мурагі
Ды не вяршыць стагі,
Не зазваніць мянташкай? —
Цяжка...

Не трэба!
Не трэба так!
З печы халоднай устань.
Ідзі да людзей, касец!
Цябе абагрэюць ўсе…
Нічога, што без касы...
Глянь —
Твой дарослы сын
Сена збівае ў пласты
Спрытна і весела як!
Гэта ж таксама — ты.
Сіла у ім — твая…
Прага да працы твая...
Кроў твая...
Вечнасць твая...

## Л е с

О лес!
Маўчу, а хочацца крычаць.
Ен, нібы прывід, нікне на вачах.
Павее вецярок — і барваў меней,
І дагараюць барвы, як праменне
Заходзячага сонейка на шкле.
Лес памірае...
Памірае лес!
Лісты, як дожджык залатых зарніц,
Плывуць на дол,
Кладуцца мякка ніц.
Бярозкі голай першародны ствол
Сцвярджае тут жыццё і хараство.
Нібыта пераможца,
Я бяру,
Я падымаю песню,
Як зару,
Барвовую,
Дрыготкую,
Усходнюю.
Няхай паслужыць для мяне паходняю
Нясу яе перад сабой.
А лес...
У словах ён, зялёны, уваскрэс.
Для музыкі,
Для думкі,
Для людзей...
Здаецца, я узнікла ў гэты дзень.

* * *

Ці цябе Красуля
Укалола рогам?
Ці табе красуня
Перайшла дарогу?
Мо дадому ехаў,
Асядлаўшы рэха,
Ды вятрыскі ў лесе
Смех увесь абтрэслі?
Можа брыў цераз брады
Дый набраў у рот вады,
Што, як сеў на ганку,
То й маўчыш да ранку?

* * *

Хоць бы посвістам
Салавейкавым
У мяне ля акенца
Стаў.
Да цябе,
Да цябе, як да вечнасці,—
Не дастаць.
Да цябе
Мне, бяскрылай вербачцы,
Пехатой не дайсці...
Я наслала б па ветрыку
Вестачку...
Але ветрык
Заціх.

* * *

А збоку —
Усё гэта проста:
Мая адзінота,
Ростань...
А збоку —
Усё гэта легка:
Блізка ты
Ці далека...
Другому не цяжка
Раіць,
Другому не цяжка
Раніць,
Другому,
Хто сам вось так
Лістоў па начах
Не чытаў...

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

**З М Е С Т**

* * * ...Шчочку да вуснаў туліць
* * *я падумала пра ракету...
Сон
* * * А на Немане — крыгаход .
* * * Можа сядзем з табой за вёслы..
Стома і песня
Каложа .
Калыханка
Неману
Ранак
* * * Не лаві заранак
Чорныя зоры
* * * З табою расставаліся
* * * Босыя ногі...
* * * Нібы сунічка на прагалку.
* * * Там, за птушынай дубровай..
* * * я, здаецца, зусім змарылася
Ловаць
* * * Салаўём на вушка пяяў.
* * * Ці сняцца табе
* * * Шаткавалі капусту двое
Двое
* * * Выйду ў палі
* * * Сонцу,— яму вядома...
Касец
* * * Бабіна лета
* * * Ты напаі мяне з крыніцы сэрца
* * * «Гэта снег...»
* * * Яснымі блакітнымі вачыма
* * * А цяпер па далёкім бары
* * * Мяне лета ў горадзе скоўвае
Гаршкалепы
* * * Першы след маланкі — баразна
* * * Я згадзілася неяк нехаця
* * * Над возерам ліпнёвы ясны дзень
* * * Прынёманская заранка
* * * Не называй мяне жаданай
Стары касец
Лес
* * * ці цябе Красуля укалола рогам?
* * * Хоць бы посвістам салавейкавым
* * * а збоку— усё гэта проста

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год